## ТЕОРИЯ И ИСТОРИЯ ПРАВА, КОНСТИТУЦИОННОЕ ПРАВО

**УДК 342**

# ЭВАЛЮЦЫЯ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У XVIII СТ.

***Л.Д. АНІСЬКОВІЧ***
**(*Прадстаўлена: А.В. ВАЛЕЎКА*)**

*На працягу ўсяго XVIII ст. у Еўропе адбываўся працэс фармавання і развіцця разгалінаванага адміністрацыйнага апарату, які будаваўся на прынцыпах прававога характару. У выніку, гэтыя замежныя змены паспрыялі з'яўленню і развіццю ў Рэчы Паспалітай ідэй мадэрнізацыі сістэмы дзяржаўнага кіравання, якія паступова пачалі ўвасабляцца ў жыццё ў другой палове XVIII ст.*

Грунтоўным пераўтварэнням сістэмы дзяржаўнага кіравання папярэднічала развіццё адміністрацыйнай думкі. Яно пачалося на пачатку XVIII ст. у Еўропе са з'яўленнем шматлікіх адміністрацыйных трактатаў, прадметам якіх было фармаванне эфектыўнай сістэмы органаў дзяржаўнай улады, якая павінна была будавацца на прынцыпах цэнтралізму, калегіяльнасці і кампетэнтнасці ўраднікаў, а таксама нарматыўнага рэгулявання, г.зн. прынцыпах прававой дзяржавы.

Паліцэістычная думка XVIII ст., цесна звязаная з камералістыкай, абапіралася на дасягненні тагачаснай эканамічнай, палітычнай і філасофскай думкі. У аснову дзяржаўнай палітыкі былі пакладзеныя прынцыпы дасягнення грамадскага дабрабыту, забеспячэння апекі насельніцтва ў галіне грамадскага правапарадку, бяспекі і задавальнення разнастайных яго патрэб. На такую фармулёўку магла паўплываць тагачасная філасофская думка, напрыклад, канцэпцыя грамадскай дамовы Томаса Гобса, паводле якой улада гарантуе парадак і бяспеку, клапоціцца аб гаспадарчым развіцці і задавольвае патрэбы асобы. Акрамя канцэпцыі Томаса Гобса, палажэнне аб дасягненні дабрабыту і магутнасці дзяржавы з'яўлялася цэнтральным элементам тэорый вядомых еўрапейскіх асветнікаў – Ёгана Генрыха фон Юсці і Ёзафа фон Зонэнфэльса [1, с. 32].

Шмат чаго чэрпалася з еўрапейскай паліцэістычнай думкі асветнікамі Рэчы Паспалітай. Так ў свет выйшла некалькі трактатаў пад аўтарствам Антонія Паплаўскага, Міхала Вяльгорскага і Юзафа Выбіцкага. Аналіз іх зместу паказвае, што аўтары зыходзяцца ў неабходнасці правядзення адміністрацыйных рэформ, дзе засяроджвалася б ўвага на кампетэнцыі адміністрацыйнага апарату, да якой меліся адносіцца пытанні паляпшэння аховы здароўя і дэмаграфічнай сітуацыі, забеспячэння асабістай бяспекі грамадзян, усестаронняга развіцця інфраструктуры і наканец клопат аб сістэме адукацыі. Гэта значыць,. што мясцовая ўлада абвязана клапаціцца аб прыросце насельніцтва, гарантаваць асабістую бяспеку грамадзян і пашыраць асвету сярод сялян. Але трэба адзначыць, что ўкараненне еўрапейскага грамадскага ўладкавання мела ахопліваць пераважна кампетэнцыі новых органаў улады, а форма арганізацыі мясцовага самакіравання мела абапірацца на гістарычную традыцыю [1, с. 25].

У Рэчы Паспалітай пераўтварэнні дзяржаўнага ладу былі распачаты ў перыяд Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Пабудова новай сістэмы дзяржаўнай улады праявіліся ва ўсталяванні Скарбовай і Вайсковай камісіі ў Польшчы і ВКЛ. [2, с. 25] У 1773-1775 гг. былі ўтвораныя яшчэ дзве камісіі – Адукацыйная і Шпітальная. Функцыі ўраду выконвала 36-асабовая Пастаянная Рада. Дзейнасць гэтых устаноў абапіралася на прынцыпы калегіяльнасці і спецыялізацыі [1, с. 23]. З мэтамі добраўпарадкавання каралеўскіх гарадоў былі створаныя Камісіі добрага парадку [2, с. 571 – 572].

Можна згадзіцца з думкай, што эфектыўнасць функцыянавання дзяржаўнага апарату залежала ад ступені разгалінаванасці яго выканаўчых органаў, у тым ліку мясцовага ўзроўню [1, с. 23].

Другім этапам працэсу эвалюцыянавання органаў мясцовай улады стаў перыяд дзейнасці Чатырохгадовага сойма, які стаў “вяршыняй рэфарматарскіх працэсаў, якія разгарнуліся ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. [3, с. 230]. На ім былі распрацаваныя тры праекты: “Формы кіравання польскага народа”, “Ваяводскія камісіі” і “Павятовыя камісіі”, а таксама было прынята некалькі ўніверсалаў 1789 г., у выніку чаго былі ўтвораныя ваяводскія камісіі, да кампетэнцыі каторых прапаноўвалася аднесці традыцыйны набор паліцэістычных задач: клопат аб паляпшэнні стану шляхоў зносін, рэгуляванне мер і вагаў, забеспячэнне грамадскага парадку і бяспекі, ажыццяўленне правасуддзя,

разгляд спрэчак паміж войскам і цывільным насельніцтвам. Гэтыя новыя органы мясцовай улады павінны былі складацца з 16 камісараў, у тым ліку з 4 прадстаўнікоў насельніцтва, строга падпарадкоўвацца цэнтральным установам, выконваючы іх распараджэнні, з пазбаўленнем магчымасці нарматворчай дзейнасці. Таксама мелася на мэце ўсталяванне 63 павятовых камісій (40 – у Кароне і 23 – у ВКЛ) з шырокімі судова-адміністрацыйнымі, сацыяльна-эканамічнымі і вайсковымі функцыямі, якія б падпарадкоўваліся органам цэнтральнай улады.

У соймавых праектах можна знайсці трапную характарыстыку адміністрацыйнай рэформы: “[…] праект ваяводскіх камісій з’яўляецца душой урада, без якой найлепшыя рэформы гэтага сойма слаба выконваліся б, што зазнаюць сёння станы Рэчы Паспалітай, не маючы ніадкуль інфармацыі пра колькасць і дыстынкцыі жыхароў, земляў і прадуктаў […]” [1, с. 29].

Такім чынам, на прыканцы 1789 года з’явіліся перадумовы для стварэння сістэмы органаў мясцовай улады. Так, завяршальным этапам працэсу, які мы даследуем, стаў праект цывільна-вайсковых парадкавых камісій, распрацаваны у пачатку лістапада 1789 г. паслом з Браслаўскага павета Тамашам Ваўжэцкім і наваградскім паслом Міхалам Бярновічам, а замацаваны подпісам і ўнесены на зацверджанне маршалкам ВКЛ Казімірам Нестарам Сапегам. Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі сталі ўвасабленнем тагачаснай адміністрацыйнай думкі і першымі спецыялізаванымі органамі мясцовай улады ў Рэчы Паспалітай.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гардзееў, Ю. Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789 – 1792) / Юры Гардзееў ; пераклад з польскай мовы Аліна і Зміцер Бялькевічы. – Смаленск : Інбелкульт, 2014. – 436 с.
2. Радаман, А. Соймік // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя : ў 2 т. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2007 – Т. 2. – С. 25–26.
3. Гісторыя Беларусі : ў 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск : Экаперспекыва, 2007. – Т. 3. – С. 344.